## VII. Зьліквідаваньне.

12. Згуртаваньне спыняе сваю чыннасьць паводле пастановы 3/4 агульнага ліку правадзейных сяброў.

13. Маёмасьць згуртаваньня перадаецца пастановаю большасьці сяброў ці аналягічнаму беларускаму літаратурна–мастацкаму згуртаваньню, ці Народнаму Камісарыяту Асьветы БССР.

Установўцы:

Кузьма Чорны (М. Раманоўскі), А. Бабарэка, З. Бядуля (С. Плаўнік), В. Шашалевіч, М. Лужанін (Ал. Каратай), Сяргей Дарожны (Сяргей Серада), Крапіва (Атраховіч), Глебка, У. Дубоўка, Я. Пушч[а] (Плашчынскі)

## № 17

## Сьпіс установўцаў Беларускага літаратурна–мастацкага згуртаваньня „Узвышша“

**Табліца 1**

| Чарг №№ | Прозьвішча, імя і па бацьку | Калі радзіўся | Адукацыя | Прафэсія і колькі год займаецца | Адрас | Хто зьяўляецца членам тымчасовага кіраўніцтва | Асабовы подпіс асобы, якая дае зьвесткі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Атраховіч Кандрат Кандр. | 1896 | Студэнт БДУ | літаратар, 6 год. | Менск, Стара–Загарадны завулак, д. 3, кв. 2 | намесьнік старшыні (Крапіва) | Атраховіч |
| 2 | Бабарэка Адам Антонаў | 1899 | вышэйшая | літаратар, 6 год | Менск, Гарбарная, д. 18, кв. 3 | сакратар кіраўніцтва | А. Бабар... |
| 3 | Глебка Пётра Тодараў | 1905 | сярэдняя | літаратар, 3 гады | Менск, Савецкая, д. 119 | | П. Глебка |
| 4 | Дубоўка Уладзімер Мікал. | 1900 | вышэйшая | літаратар, 5 год. | Масква, Мала–Грузінская, д. 34, кв. 13 | | У.Д… |
| 5 | Каратай Алесь Амброзаў | 1909 | студэнт | літаратар, 2 гады | Менск, Старасла-бодзкая, д. 20, кв. 1 | | Ал. Каратай (Лужанін) |
| 6 | Плаўнік Самуіл Якімаў | 1886 | вышэйшая | літаратар, 16 год | Менск, 1–ая Доўгабродзкая, 25, кв. 4 | | С.Плаўнік (З.Бядуля) |
| 7 | Плашчынскі Язэп Паўлюкоў | 1902 | нясконча-ная выш. | літаратар, 4 г. | Менск, 2–ая Лекерта, д. 4, кв. 1 | | Я. Пушча (Плашчынскі) |
| 8 | Раманоўскі Мікола Каралёў | 1900 | нясконча-ная выш. | літаратар, 4 г. | Менск, Нова–Сярпухоўская, д. 6, кв. 1 | старшыня і галоўны рэдактар | М. Раманоўскі (К. Чорны) |
| 9 | Серада Сяргей Міхайлаў | 1907 | студэнт | літаратар, 2 гады | Менск, Савецкая, 119 | | Сяргей Серада (С. Дарожны) |
| 10 | Шашалевіч Васіль | | студэнт | літаратар, 4 гады | | | В. Шашалевіч |